Дарога атаясамліваецца А. Разанавым перш за ўсё з гісторыяй, развіццём як агульначалавечай супольнасці, так і канкрэтнай асобы, нагадвае "тору чалавечай гісторыі: што на ёй выдрукоўваюць адны, сціраюць, выдрукоўваючы сваё, другія" [1, с. 374].

На думку А. Разанава, кожны з нас у жыцці ідзе сваёй дарогай, паступова пераходзячы на больш шырокія, бо "дарога – як рака: разгаліноўваецца на шматлікія прытокі – сцежкі і цячэ паўз двары, гарады, агароды, усё закранаючы сабою і ўсё пакідаючы па-за сабою" [1, с. 373]. Ззаду застаюцца разнастайныя падзеі, рэчы, нават цэлыя эпохі, а людзі ўсё працягваюць крочыць па шляхах, пакідаючы адбіткі сваіх слядоў на паверхні гісторыі: "Адзінага, каго яна [дарога] не можа пакінуць, – гэта чалавека: калі рухаецца ён – рухаецца і яна, калі спыняецца ён – спыняецца і яна. Ён – яе другое "я", яе спадарожнік і правадыр, які дырыгуе, як ёй ісці – таропка ці паволі, ціха ці гучна" [1, с. 373].

Вобраз дарогі, шляху А. Разанаў перадае пры дапамозе разнастайных асацыяцый. Вялікая роля адводзіцца гукапісу (асабліва ў вершаказах). Вакол аднаго слова-дамінанты, якое часцей выносіцца ў загаловак, ужываюцца словы з аднолькавымі ці падобнымі спалучэннямі гукаў з мэтай прадэманстраваць іх пэўную роднаснасць, сэнсавую сувязь, а таксама адлюстраваць характарыстыку паняцця.

Вобраз дарогі, які ўвасабляе гісторыю, ахутаны сакральнасцю і велічнасцю. Нягледзячы на пэўную дваістасць і шматаблічча падзей-шляхоў (аўтар шырока ўжывае словы сцежка, брук, шаша, гасцінец і інш.), менавіта дарога, на думку А. Разанава, зберагае для нас памяць пра мінулае ў выглядзе слядоў (пад імі разумеюцца старажытныя рэчы, паданні, гістарычныя падзеі і т. п.). Пры гэтым паэт успрымае вобраз дарогі як архетып, сцвярджаючы, што шлях – нешта ўніверсальнае і звышнатуральнае, нават неспасцігальнае.

**Літаратура**

1 Разанаў, А Танец з вужакамі: выбранае / А. Разанаў. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1999. – 462 с.

***Т. А. Зубік***
*Навук. кір.* ***А. В. Брадзіхіна,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

**ПРАБЛЕМА ЛІТАРАТУРНАГА ГЕРОЯ Ў ПРОЗЕ Л. РУБЛЕЎСКАЙ**

У рэчышчы гісторыяцэнтрычнай, напісанай па канонах масавай літаратуры, прозе Л. Рублеўскай створана ўжо цэлая галерэя жаночых вобразаў інтэлігентак-інтэлектуалак, схільных да беларускасці, іроніі, інтэлектуальнай творчасці і розных гістарычных загадак. Яны падобныя і знешне (Кася з "Сэрца мармуровага анёла", Магдаліна Дарбут з аповесці "Пярсцёнак апошняга імператара", Паліна Ведрыч з рамана "Золата забытых магіл"), і паводле ладу жыцця. Другі тып гераінь-жанчын, – тыя, што належаць сюжэтным паралелям з мінуўшчыны: каханыя, паплечніцы, жонкі шляхцічаў, імператараў ды інсургентаў (Вальжына Рагманава ("Золата забытых магіл"), Агна Чагноўская, Настасся Дарбутова ("Пярсцёнак апошняга імператара"). Яны намаляваны ў лепшых традыцыях У. Караткевіча – гордыя, высакародныя, цнатлівыя, мудрыя – інакш кажучы, сапраўдныя арыстакраткі духу. У абодвух выпадках жанчына ў творах Л. Рублеўскай выконвае ролю духоўнага лідара**.**

У сваю чаргу, адмоўныя персанажы-мужчыны не ўпісваюцца ў шаблон рамантычнага інтэлектуала-ваяра за беларускасць (Радзік з "Сэрца мармуровага анёла",

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Марк Ялецкі і Іван Хмель з аповесці “Пярсцёнак апошняга імператара”). Гэта актыўныя ўдзельнікі тыповага для твораў пісьменніцы канфлікту, сутнасць якога выяўляецца праз сутыкненне годнай, ахвярнай мінуўшчыны і прагматычнай, сквапна-драпежнай сучаснасці. Такія персанажы належаць групе былых жаніхоў / мужоў галоўнай гераіні, якіх яна змяняе на духоўна блізкіх “сяброў па авантуры”, доўгавалосых “няўдачнікаў”, што ўрэшце ператвараюцца ў прынцаў.

Іншымі словамі, кагорта антыгерояў (неадназначна ідэальных герояў) Л. Рублеўскай мае тую асаблівасць, што яны нярэдка займаюць пазіцыі галоўных персанажаў, якія праходзяць усе авантуры і выпрабаванні па ратаванні беларушчыны, аднаўленні памяці і заваёўваюць тым самым месца ў сэрцы галоўнай гераіні. Каханне ды жыццёвыя іспыты дазваляюць ім раскрыцца з найлепшага боку, наблізіцца да “асучасненага” рамантычнага ідэалу, вартага іх продкаў – каралёў ды інсургентаў, і выявіць свой спрыт, рашучасць і мужнасць.

Такім чынам, адносіны да кожнага з герояў, да часу і прасторы, у якіх яны жывуць, будзе тое мінуўшчына ці сучаснасць, выразна прачытваюцца шляхам дэталей, аўтарскіх інтанацый, апісанняў (партрэта, мімікі, вопраткі, пейзажу). І паўсюдна, усімі сродкамі – ад рамантычна-эстэтызаваных да меладраматычна-псеўдадакументальных – прасочваецца галоўны прынцып і мэта твораў пісьменніцы: зацікавіць беларушчынай.

***К. А. Капылова***
*Навук. кір.* ***В. А. Ляшчынская****,*
*д-р філал. навук, прафесар*

## ПРАЦА І БЕЛАРУС ПРАЦЫ Ў ПАРЭМІЯХ

У апошні час парэміі (тэрмін выкарыстоўваецца для абазначэння прыказак паводле наймення новага раздзела – парэміялогія) сталі аб’ектам актыўнага даследавання моваведаў і найперш як сродку захавання і трансляцыі ў часе і прасторы культурнай інфармацыі, сфармуляваных у іх правілаў, якія пашыраюцца на ўсе аналагічныя з’явы жыцця народа. Парэміі як устойлівыя адзінкі з’яўляюцца крыніцай пазнання і самога народа, яго культурных каштоўнасцей. У прыватнасці, нас зацікавілі парэміі для пазнання аднаго аспекта ў гісторыі жыцця беларусаў – месца і ролі працы ў жыцці народа, адносін чалавека да яе, ці пазнанне тых правілаў, якімі кіруюцца беларусы адносна гэтай тэмы і якія характарызуюць сам народ, а крыніцай тэматычнай групы парэмій паслужыў унікальны слоўнік парэмій А. С. Аксамітава [1].

Працоўная дзейнасць чалавека парэміялогіяй рэпрэзентуецца ў супрацьлегласці, але насуперак імкненню да адмоўнага полюса ацэначнай шкалы найбольш колькасна прадстаўлены парэміі са станоўчай ацэнкай. Аналіз парэмій дазваляе выдзеліць некалькі крытэрыяў ацэнкі добрай працы: абавязковая наяўнасць працы (*Без працы жыць – неба капціць; Работа – не забота: забота, калі няма работы* і інш.), добрасумленнасць (*Рабі так, каб сабак не дражніць і людзей не смяшыць; Працу палюбіш – чалавекам будзеш*), адказнасць і руплівасць (*Каб зарадзіўся лён, адбівай за паклонам паклон; Трэба нахіліцца, каб з ручая напіцца; Па дарозе ідучы, грыбоў не назбіраеш; Арэх не раскусіш – зерне не з’ясі; Не капаўшы студні, вады не піць* і інш.), стараннасць (*Без мазаля на руках не будзеш мець хлеба ў зубах; Як пасцелішся, гэтак і выспішся*; *Хто хоча шчасліва жыць, той працу павінен любіць* і інш.).

У выдзеленай групе парэмій беларускай мовы адлюстроўваюцца самыя розныя аспекты ўяўлення беларусаў аб працы, і ўсе яны, з якіх найбольш значнымі выступаюць нястомнасць і абавязковасць працы, адданасць, стараннасць, даводзяць культурныя каштоўнасці, якімі кіраваліся нашы продкі і якія яны пакінулі нам у спадчыну, утрымліваюць веды пра практычны вопыт беларусаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ